# Пачатковая школа

4/94

№4-1994



«...Паўстанне
1794 года
пацярпела
паражэнне.
Але паходню волі,
незалежнасці і
грамадзянскай
справядлівасці,
запаленую
Касцюшкам
і яго
паплечнікамі,
затушыць
ужо было
немагчыма».

*У. Емяльянчык.*

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка.



Мерачоўшчына (Івацэвіцкі раён)— …м, дзе нарадзіўся Т. Касцюшка.

Edited with the trial version of Foxit Advanced PDF Editor
To remove this notice, visit: www.foxitsoftware.com/shopping



# Сям'я і выхаванне дзяцей у феадальнай Беларусі

*Рашэннем Юнеска 1994 год аб'яўлены міжнародным годам сям'і. Гэтым актам падкрэсліваецца выключна важная роля пярвічнай ячэйкі грамадства ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач, што стаяць на сучасным этапе развіцця сусветнай цывілізацыі. Беларуская сям'я нароўні з многімі іншымі мае сваю шматвяковую гісторыю, з якой і сёння вельмі многае можна ўзяць на прагматычны і духоўны спажытак.*



Спрадвеку сям'я была самай дзейснай крыніцай развіцця народнай педагагічнай думкі, своеасаблівым каталізатарам выхаваўчых ідэй і галоўным сацыяльна-грамадскім інстытутам фарміравання кожнай асобы і людской супольнасці ўвогуле. Ва ўсе часы сям'я заставалася хоць і не адзіным, але асноўным месцам, дзе ажыццяўлялася выхаванне падрастаючых пакаленняў. І чым меншыя дзеці, тым большай была ўдзельная вага сямейнага выхавання ў іх развіцці.

Сённяшняя цікавасць да гісторыі беларускай сям'і перыяду феадалізму невыпадкохоўнай культуры нашага народа. Да іх ліку ў першую чаргу можна аднесці завяршэнне фарміравання беларускай народнасці, развіццё і станаўленне дзяржаўнасці; хоць запозненае і няпоўнае, але ўсё ж узнікненне і працяканне адраджэнцкіх плыняў, якія суправаджаліся небывалым да тае пары ўзлётам і сацыяльна-культурных працэсаў.

Сямейны побыт беларусаў у XIV — XVIII стст. характарызаваўся надзвычай шырокай разнастайнасцю, шматварыянтнасцю яго арганізацыі. Тут арганічна спалучаліся векавыя традыцыі і павевы надыходбяруць пачатак яшчэ ў глыбокай старажытнасці, і паступова зараджаліся новыя рысы сям'і, якія адпавядалі асобным тэндэнцыям узнікаючай капіталістычнай арганізацыі грамадства.

Асноўнай ячэйкай большай часткі дэмаграфічнага масіву беларускай народнасці была сялянская сям'я. Менавіта яна вызначальна адлюстроўвала стан сямейнага побыту і многіх сацыяльна-педагагічных працэсаў тагачаснага грамадства. На беларускіх землях яшчэ ў раннефеадальны перыяд з распаўсюджваннем ворыўнага земляробства з вялікіх пат-

Edited with the trial version of
Foxit Advanced PDF Editor
To remove this notice, visit:
www.foxitsoftware.com/shopping

ршых захоўваліся ў многіх ыццёвых сферах, асабліва ў мейна-бытавой.

Такім чынам, у разглядае-ы перыяд існавалі два тыпы м'яў: малая (нуклеарная) м'я, якая складалася са любнай пары і яе дзяцей, і лікая, што ўключала непасэдных родзічаў двух-трох пааленняў. У сваю чаргу вялікія ем'і былі таксама двух тыпаў: ацькоўская сям'я, куды ваходзілі бацькі, дзеці і ўнукі, брацкая сям'я, якую ўтваралі ем'і братоў, а часам і сясцёр. акія сем'і мелі агульную аспадарку, непадзеленую маёасць і ўяўлялі адну падаткаую адзінку, якая называлася ымам. Кааперавалiся паміж абой і малыя сем'і. Часта, асабліва на Палессі, вялікія і малыя сем'і, асобныя дымы аб'ядноўваліся ў дворышчы для выканання сумеснай гаспадарчай працы. Падобным чынам сваяцкія (бацькоўскія, брацкія) і несваяцкія сем'і аб'ядноўваліся ў асобную адзінку падаткаабкладання — службу. Вось чаму само паняцце «сям'я», ці «сем'іца», азначала аб'яднанне, агульнае ўладанне, саўладанне.

Такое сумяшчэнне сямейна-радавых і суседска-таварыскіх адносін наклала істотны адбітак на фарміраванне абшчынных, калектывісцкіх пачаткаў у педагагічных поглядах народа. Выхаваўчыя мэты зыходзіліся на фарміраванні прыстойнай асобы, узровень дасканаласці якой у многім вызначаўся яе карыснасцю для грамадства. Гэтаму ж падпарадкоўваўся і змест адукацыйна-выхаваўчых працэсаў, якія спантанна або арганізавана ажыццяўляліся ў народзе. На аснове супольнасці будаваліся многія метады і сродкі народнай педагогікі.

У XVI ст., з правядзеннем аграрнай рэформы і інтэнсіўным развіццём фальварачнага вядзення гаспадаркі, набіраюць сілу працэсы індывідуалізацыі сялянскай сям'і, якія суправаджаліся карэннай ломкай сацыяльна-бытавых устояў сярэднявечча і сцвярджэннем ідэй індывідуалізму. Хаця трэба адзначыць, што на беларускіх землях падобныя ідэі ўсё ж не дасягнулі таго ўзроўню, да якога яны ўзняліся ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. Бо тут яны абазначылі інварыянтнасць дасягнення ўласнага шчасця, уласнай дасканаласці, але абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра.

Сям'я гараджан была вельмі падобнай да сялянскай, і толькі розны характар вытворчасці і грамадскага жыцця абумоўліваў некаторую яе спецыфічнасць, асабліва ў сферы сямейнага побыту, хоць ён, як і самі сем'і, быў шматварыянтным, што з'яўлялася характэрным і для іншых саслоўяў беларускага грамадства.

Большую своеасаблівасць мелі сем'і беларускай шляхты, якія ў залежнасці ад маёмаснага дастатку больш або менш адрозніваліся ад сялянскіх ці гарадскіх сем'яў. Сістэма выхавання дзяцей тут была падпарадкавана фарміраванню сацыяльна-культурнай каставасці. Шляхецкія дзеці часта атрымлівалі вышэйшую адукацыю, у тым ліку і за мяжой. Гэта быў адзін з дзейсных каналаў распаўсюджвання агульнаеўрапейскай культуры на беларускіх землях. Шляхецкае саслоўе дало свету цэлую плеяду выдатных дзеячаў (Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, браты Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі і многія іншыя), якія ўзняліся вышэй каставых, а падчас і канфесійных уяўленняў і сталі сапраўднымі выразнікамі інтарэсаў усяго беларускага народа.

Сям'я была першаснай сацыяльна-эканамічнай ячэйкай феадальнага грамадства, і да таго ж на ёй у якасці адной з асноўных ляжала задача выхавання падрастаючых пакаленняў, перадачы ім назапашанага вопыту, этнічных і сацыяльных норм, традыцый, стэрэатыпаў светаўспрымання. У народзе заўсёды лічылі, што неабходнай умовай для гэтага з'яўляюцца згода і лад у сям'і, паколькі, як падкрэсліваў Ф. Скарына, «незгода бо и найболшие царства разрушаеть» (7, 111). Вось чаму стварэнне сям'і было адной з самых значных з'яў у грамадскім жыцці і ёй надавалася выключна важнае значэнне. З ранняга дзяцінства выхаванне хлопчыкаў і дзяўчынак было падпарадкавана падрыхтоўцы іх да будучага сямейнага жыцця. Першых рыхтавалі да вядучай ролі мужа, руплівага і дбайнага гаспадара, а другіх — да ролі паслухмянай, працавітай жонкі.

У выбары нявесты вядучую ролю адыгрывалі бацькі. Але шлюбны саюз неабавязкова заключаўся па прымусу. Часцей за ўсё ў аснове ляжалі ўгаворы, растлумачэнне. Так, словамі песні бацькі павучалі:

...Ні бяры, сынок, ты саяніцы,
Ні саяніцы, ні бушмашніцы,
А бяры, сынок, андарашніцу.
А саяніца — горка п'яніца,
А бушмашніца — падугольніца,
Андарашніца — то работніца (1, 83).

Больш таго, у народзе разумелі, што сапраўдная сям'я, якая з поспехам будзе выхоўваць дзяцей, не можа быць пабудавана без кахання. Вось чаму Ф. Скарына, абапіраючыся на такія ўяўленні, пісаў: «...Мужи с своими женами имають во любви жити» (7, 116). Фальклорная скарбонка нашага народа сведчыць аб тым, што твораў на любоўную тэматыку ў той час было вельмі многа.

Edited with the trial version of Foxit Advanced PDF Editor
To remove this notice, visit: www.foxitsoftware.com/shopping

Ужо тады назіраюцца спробы паставіць каханне на адно з вядучых месцаў пры стварэнні сям'і. Часта чуліся скаргі маладой, «што звянчалі мяне да з тым чужапанцам, да з тым незнаёмым, невядомым» (1, 83).

Сам шлюбны абрад меў на мэце надаць грамадскую значнасць стварэнню сям'і, закласці падмурак трывалай, дружнай ячэйкі грамадства. Ён змяшчаў мноства яркіх, эмацыянальна насычаных, па-мастацку аздобленых рытуалаў, якія неслі ў сабе непаўторны нацыянальны каларыт і значныя выхаваўчыя магчымасці. Шлюб уключаў у сябе шэраг этапаў: сватанне і агледзіны, заручыны, вянчанне і само вяселле. Урачыстасць, пышнасць вясельнага рытуалу, які працягваўся некалькі дзён, як бы сімвалізавалі пачатак будучага сямейнага шчасця, трываласці сямейных сувязей.

Моц сямейна-шлюбнага саюзу падтрымлівалася і вельмі адмоўнымі адносінамі грамадства да нявенчанага шлюбу, да пазашлюбных сувязей і разводаў. Дзеці ад нявенчанага шлюбу былі пазбаўлены многіх грамадзянскіх правоў і звычайна папаўнялі катэгорыі ніжэйшых сацыяльных слаёў.

Самай значнай падзеяй у жыцці сям'і было нараджэнне дзіцяці. Дайшоўшыя да нас багацці вуснай народнай творчасці сярэднявечча ўтрымліваюць шмат матэрыялу, які сведчыць аб выключнай увазе народа да гэтай падзеі. Бацькі, асабліва маці, і само немаўлятка акружаліся павагай і пашанай. З першых дзён праяўляўся клопат аб выхаванні прыстойнага чалавека. Каб дапамагаць бацькам гадаваць і выхоўваць дзяцей, у іх з'яўляюцца такія названыя суродзічы, як бабка-пупарэзніца, кум і кума.

Наогул факт з'яўлення на свет новага жыцця быў абстаўлены мноствам арыгінальных абрадаў і рытуалаў. Яны настолькі глыбока ўвайшлі ў сямейны побыт беларускага народа, што ён, практычна адзіны са славян, захаваў па сённяшні дзень уласцівую толькі яму багатую хрэсьбінную паэзію. Хрэсьбінныя песні феадальнай эпохі ў запісах XIX ст. зычаць нованароджанаму дзіцяці шчаслівы лёс, матэрыяльны дастатак:

...Кумочак ходзіць, дзіцятка носіць,
А у бога долі просіць:
— А дай жа, божа, етый дзіцяці
Усякую долю узяці:
І хлебавую, і салявую,
Трэцюю — здаровейкую
(1, 78 — 79).

Колькасць дзяцей у сялянскіх сем'ях была вельмі рознай. Як мяркуюць многія даследчыкі, тыповай была сям'я, дзе мелася 3 — 5 дзяцей. Многія сем'і мелі і больш. Вядома, што ўвогуле нараджалася дзяцей многа, але высокі ўзровень смяротнасці значна зніжаў сярэднія лічбы. У народзе лічылі, што калі дзяцей багата, то хоць клопату хапае, але ж і радасці шмат. Як суровае папярэджанне гучыць прымаўка: «Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха» (4, 117).

Побыт сярэдневяковай беларускай сям'і быў пабудаваны на арганічным спалучэнні абшчыннасці, супольнасці і строгага падпарадкавання аўтарытэту адной асобы. У кожнай сям'і, згодна са звычаёвым правам, якое ўскосна падмацоўвалася і юрыдычнымі законамі, галавой сям'і быў, як правіла, старэйшы з мужчын. Слова гаспадара было законам для ўсіх яе членаў. Павага да галоўнага, старэйшага падтрымлівалася і эканамічна-заканадаўчымі і звычаёвымі правамі. Напрыклад, у многіх беларускіх сем'ях існавалі рысы так званага марыяту, калі асноўная частка сямейнай маёмасці пераходзіла ў спадчыну да старэйшага сына, а астатняя яе частка дзялілася паміж іншымі членамі сям'і. У той жа час у самой сям'і многія віды дзейнасці патрабавалі сумеснай працы, дзе кожны набываў свой статус у залежнасці ад яго ведаў і ўменняў у практычнай дзейнасці, што стымулявала рост індывідуальнай варыятыўнасці яго паводзін і вяло да развіцця пачуцця ўласнай годнасці. З другога боку, міжсямейныя адносіны ў кожным пасяленні характарызаваліся своеасаблівай гамагеннасцю і ў многім будаваліся на абшчынных прынцыпах («гвалт», «дворышчы», «талака», «службы» ў вёсцы, арцель у горадзе).

Усё вышэйсказанае цалкам мае дачыненне і да гарадской сям'і. І толькі ў сем'ях шляхты, асабліва заможнай, перавагу мелі індывідуалістычныя падыходы, хаця і ў іх з павагай і адабрэннем ставіліся да абшчыннасці, супольнасці ў многіх сферах арганізацыі грамадскага жыцця. Падобны дуалізм гаспадарча-бытавога ўладкавання сям'і надаваў адчувальную дынаміку развіццю многіх працэсаў, у тым ліку і прагматычна-выхаваўчых.

Сінкрэтызм арганізацыі сямейнага быту выразна праявіўся і ў становішчы жанчыны ў феадальным грамадстве Беларусі. Нягледзячы на больш высокае сацыяльнае становішча мужчыны, беларуская жанчына не знаходзілася ў дэспатычна-прыгнечаных сямейных умовах, як гэта было ў многіх іншых народаў. Наадварот, як слушна адзначаюць многія даследчыкі, жорсткае абыходжанне мужа з жонкай нават давала апошняй права разрываць шлюбныя вузы. Афіцыйнае заканадаўства ўмацоўвала пэўную незалежнасць жанчыны і ў эканамічных адносінах. Існавала так званае права вена, згодна з якім жонка валодала 1/3

Edited with the trial version of
Foxit Advanced PDF Editor
To remove this notice, visit:
www.foxitsoftware.com/shopping

часткай маёмасці сям'і пасля смерці мужа. Такое высокае грамадскае і сацыяльна-эканамічнае становішча жанчыны было характэрным для беларускага народа і заўсёды захоўвалася ў сямейных традыцыях. Так, член Паўночна-Заходняга аддзела рускага таварыства І. А. Сербаў пасля адной з экспедыцый на пачатку XX ст. у самую глухамань Беларускага Палесся, дзе жылі беларусы-сакуны, якія беражліва захоўвалі традыцыі сівой мінуўшчыны, пісаў: «Жанчына ў сакуноў карыстаецца аднолькавымі правамі з мужчынамі» (5, 48). Беларускі мысліцель XVI ст., аўтар трактата «Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян», Міхалон Ліцвін адзначаў, што жанчына ў Вялікім княстве Літоўскім мае намнога болей свабоды, чым жанчына суседніх краін (8, 25).

Усё гэта дае падставы многім навукоўцам сцвярджаць, што беларуская жанчына прымала актыўны ўдзел не толькі ў гаспадарчых справах сям'і, у арганізацыі быту, але і ў выхаванні дзяцей падчас адыгрывала дамінуючую ролю. Пачынаючы з калыханак, маці фарміравала ў дзяцей існаваўшыя тады стэрэатыпы светаўспрымання і грамадскага ўладкавання. Праз маці закладваліся асновы культуры і самасвядомасці. Невыпадкова, што менавіта Сімяон Полацкі, знакаміты айчынны педагог, які значную частку свайго жыцця пражыў у Маскве, быў першым на Русі, хто ўслых загаварыў аб ролі маці ў выхаванні дзяцей.

Даволі высокае становішча жанчыны ў беларускім грамадстве, актыўны і дзейсны яе ўдзел у выхаванні падрастаючых пакаленняў спрыялі таму, што ўвогуле для беларусаў характэрнымі і вызначальнымі рысамі характару станавіліся чалавечнасць, добразычлівасць, стрыманасць, цярплівасць, шчырасць, міралюбнасць. Менавіта тут бачацца вытокі таго, што для нашага народа зусім не характэрныя жорсткасць, помслівасць, ваяўнічасць. Гэтай прычынай у многім тлумачыцца і высокі лірызм душы беларусаў.

Звычайна да сістэматычнага выхавання бацька падключаўся паступова, з ростам дзіцяці. На думку асобных вучоных, гэты працэс перакладваўся поўнасцю на яго плечы, калі дзецям спаўнялася 12 — 14 гадоў (8, 25). Але з гэтым наўрад ці можна пагадзіцца, бо працэс далучэння дзяцей да гаспадарчых спраў пад непасрэдным кіраўніцтвам бацькі адбываўся значна раней — з 5 — 6 гадоў. Вядома, галава сям'і больш увагі ўдзяляў сынам, як будучым гаспадарам. З 12 — 14 гадоў падлеткі ў той час станавіліся амаль што паўнацэннымі дарослымі членамі сям'і. Нездарма ж у выпадку смерці бацькі сыны ўступалі ў спадчыннае права з 12 гадоў. Дарэчы, і самі аўтары манаграфіі, на якую вышэй зроблена спасылка, сцвярджаюць, што іншы раз у шлюб дзяўчаты ўступалі нават у 12 — 13 гадоў, а хлопцы — у 14 — 16 гадоў.

З глыбокай старажытнасці трывалым падмуркам этнапедагагічнай культуры нашага народа былі звычаі, традыцыі і абрады. Фарміраванне асобы ў старажытным грамадстве працякала ў строга акрэсленых межах яе дзейнасці і ўчынкаў. З дзяцінства чалавек у імператыўна-катэгарычнай форме ўспрымаў шэраг прадпісанняў і забарон наконт правілаў паводзін, спосабаў дзейнасці і нават напрамку думак. З пакалення ў пакаленне без абмеркавання, а часта і без абгрунтавання перадаваліся выпрацаваныя і адшліфаваныя сацыяльна-грамадскім і духоўна-выхаваўчым вопытам тыя звычаі, традыцыі і абрады, якія стваралі аптымальныя ўмовы для арганізацыі выхавання дзяцей.

Дзякуючы звычаям сям'я мела даволі дзейсныя «педагагічныя» рычагі ўздзеяння на дзіця. Звычаі не проста выпрацоўвалі спосабы паводзін чалавека, а ўсталёўвалі ў ім веру ў існаванне вышэйшых законаў грамадскай уладкаванасці, спасціжэнне і выкананне якіх, як уяўлялася, павінна забяспечыць найлепшыя ўмовы зямнога быцця. Многія сямейныя звычаі стваралі трывалы падмурак для распрацоўкі метадалагічных асноў выхавання дзяцей. Так, напрыклад, рускі этнограф XIX ст. Д. Г. Булгакаўскі адзначаў, што ў палешукоў існавала павер'е, што калі немаўлятка абазваць жабай, то ў дзіцяці вырасце горб (7, 188). І вось на падставе гэтага ў сем'ях існаваў звычай не абзываць дзяцей абразлівымі словамі. Як бачна, гэта спантанна ўсталёўвала ў сямейным выхаванні прынцыпы гуманнага, добразычлівага абыходжання з дзецьмі і апоры на станоўчыя якасці выхаванцаў.

Традыцыі ў галіне этнапедагагічнай культуры спрыялі перадачы кожнаму наступнаму пакаленню такіх кампанентаў грамадскай свядомасці, як ідэі, погляды, густы, ідэалы, перакананні, веды і інш. Агульнавядома высокая выхаваўчая роля традыцый у радавітых шляхецкіх сем'ях, якія беражліва захоўвалі стэрэатыпы рыцарскай культуры. Але ж і простыя сялянскія сем'і ў імкненні набыць лепшую грамадскую ацэнку падтрымлівалі і прымнажалі спадчынныя якасці, якія былі характэрнымі для многіх пакаленняў іх роду. С. Пашкевіч пры даследаванні ў XIX ст. жыцця і быту беларускіх сялян пісаў: «...Маладыя заўсёды трымаюцца паводзін і абыходжання старых, а тыя старадаўнасці» (8, 33). Невыпадкова ў народзе лічылі, што дзеці амаль заўсёды падобныя на сваіх бацькоў. Таму, напрыклад, пры выбары жонкі раілі: «Пазірай на матку, а жаніся на дзіцятку» (4, 27). Пачуццё гонару за свой род і

Edited with the trial version of Foxit Advanced PDF Editor
To remove this notice, visit: www.foxitsoftware.com/shopping

павага да продкаў праявіліся і ў тым, што к канцу XVI ст. нават простыя сяляне атрымлівалі ў спадчыну трохкампанентныя найменні-прозвішчы (прозвішча, імя, імя па бацьку).

Пэўныя адрозненні ў выхаванні дзяцей існавалі ў сем'ях розных слаёў беларускага грамадства. Сялянскія і гарадскія сем'і перш за ўсё мелі на мэце падрыхтоўку дзяцей да будучай працоўнай дзейнасці. Іх з 5 — 6 гадоў ужо непасрэдна ўключалі ў гаспадарчую дзейнасць у якасці памочнікаў. У сем'ях гараджан-рамеснікаў дзеці таксама з малых гадоў прымалі ўдзел у прадукцыйнай працы, паступова набывалі прафесійныя навыкі, часам станавіліся вучнямі, каб атрымаць спецыяльнасць. Дзяўчынкі пад непасрэдным наглядам маці ўдзельнічалі ў абслугоўванні сям'і, набывалі навыкі шыцця, ткацтва, гатавання ежы і г. д. Сямейнае выхаванне ў заможных гараджан і багатай шляхты было скіравана на набыццё нашчадкамі якасцей, што давалі магчымасць у будучым захоўваць і павялічваць набыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры сваіх бацькоў.

Характэрна, што, нягледзячы на маёмасна-саслоўныя адрозненні, існаваў шэраг рыс, характэрных для ўсіх беларускіх сем'яў сярэднявечча. Акрамя любві да працы, вялікая ўвага ўдзялялася прывіццю любві і павагі да сваіх бацькоў, дзядоў, продкаў. Значнае месца ў змесце сямейнага выхавання адводзілася фарміраванню патрыятычных пачуццяў, адданасці і вернасці свайму народу, свайму краю. Выкананне хрысціянскіх запаветаў часта вымяралася адносінамі асобы да іншых людзей. «Хто людзей не саромеецца — той Бога не баіцца» (3, 148), — сцвярджалася ў адной з прымавак, запісаных у XVII ст.

З павагай ставіліся ў беларускіх сем'ях да ведаў, адукаванасці, кнігі. З сівой мінуўшчыны захаваліся ў вуснай народнай творчасці творы, якія сведчаць аб гэтым. Так, у XIX ст. у палескай глухамані была запісана такая прыказка аб кнізе: «Бывъ собі дурень, на дошку дывывся, зробывся розумный» (2, 169).

Пэўную цікавасць выклікаюць народныя погляды на імкненне людзей да матэрыяльнага багацця. У многіх сем'ях такое імкненне не толькі не асуджалася, а, наадварот, уяўлялася адной з мэт чалавечага жыцця. Праўда, заўсёды падкрэслівалася неабходнасць набыцця матэрыяльных даброт сумленным шляхам, а таксама, што ўласнае шчасце не можа будавацца на няшчасці іншых. Нават падарункі лёсу (знойдзеныя скарбы, дары чараўнікоў і іншае) мелі станоўчую маральную ацэнку, калі яны даставаліся прыстойным асобам. Аднак у той жа час падкрэслівалася і дэфармуючае ўздзеянне багацця на маральна-духоўную прыроду чалавека. Гучалі нават і такія перасцярогі: «...Гдзе багатства там шчасця немаш» (6, 183).

Многія іншаземцы, што вандравалі ў той час па беларускіх землях, пакінулі ўспаміны, у якіх давалі вельмі высокую ацэнку вынікам выхавання ў простанародных сем'ях. І сучасныя даследчыкі падкрэсліваюць станоўчы ўплыў народнай педагогікі на выхаванне падрастаючых пакаленняў. Адбывалася гэта таму, што выхаванне не вычлянялася з жыцця, а арганічна ўпляталася ва ўсе сямейныя адносіны. Дзяцей не рыхтавалі да будучага жыцця, азначанага пэўнымі ўзроставымі ці іншымі межамі, а паступова ўключалі ва ўсе сферы чалавечага існавання.

Прызнаннем выхаваўчых заслуг простай беларускай сям'і з'яўляўся, напрыклад, звычай дзядзькавання, які ўкараніўся ў грамадскае жыццё к канцу XVI ст. і быў распаўсюджаны аж да канца XIX ст. Сутнасць яго заключалася ў тым, што дзеці заможнай шляхты аддаваліся на выхаванне ў звычайную сялянскую сям'ю з мэтай фарміравання ў маладых шляхцічаў лепшых фізічных і духоўных якасцей простага народа.

## ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская народная вусна-паэтычныя творчасць. — Мн., 1967.

2. Пинчуки. Этнографическій сборникъ /Собрал Д. Г. Булгаковскій// Записки императорского географического общества по отделению этнографии. — Т. XIII. — Вып. 3. — СПб, 1890.

3. Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. Конец XVI — нач. XVII в. — Мн., 1983.

4. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. — Кн. 2. — Мн., 1967.

5. Сербов И. А. Белорусы-сакуны. Краткій этнографическій очерк. — Птг., 1915.

6. Сержбутовскій А. К. Сказки и разсказы белорусов-полешуков. — СПб., 1911.

7. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. — Мн., 1990.

8. Сям'я і сямейны быт беларусаў /В. К. Бандарчык, Г. К. Курыловіч, Л. В. Ракава і інш. — Мн., 1990.

**В. С. БОЛБАС,**
**кандыдат педагагічных навук.**

г. п. Акцябрскі,
Гомельская вобласць.